**Мінскевіч С.Л. (Мінск)**

## Элементы рамантызму ў творчасці Максіма Багдановіча

Сітуацыю ў літаратурным працэсе канца XVIII – сярэдзіны XIX ст. акрэсліваюць як эпоху рамантызму, ці «рамантычны нералом». У той час на першы план літаратуры як інструмента разумовага пазнання выйшла даследаванне мікракосму чалавека, свету чалавечай душы і акіяна яго пачуццяў. Безумоўна, наступныя літаратурныя метады і плыні арганічна ўвабралі і перапрацавалі дасягненні рамантызму, таму ў творчасці літаратараў, якія прапанавалі свае ўзоры «краснага пісьменства» на пачатку XX ст., выяўляюцца рамантычныя маркеры. «Як птушка ў гібкіх трасніках, / Стралою думка мільганула / І ўраз жа знікла, патанула, / Як птушка ў гібкіх трасніках. / Ды ўсё ж душа яе пачула / І ўжо пяе ў такіх славах: / «Як птушка ў гібкіх трасніках, / Стралою думка мільганула» [1, с. 139]. У гэтых радках верша «Трыялет» М. Багдановіч трапна перадае адчуванне натхнення, нараджэння вобраза і «пералівання» яго ў верш ці нават песню, пра што сведчыць дзеяслоў «пяе».

Прывядзем вядомы верш амерыканскага рамантыка Генры Лангфела «Старала і песня»: «Стралу пусціў я ў белы свет, / Упала недзе, немавед; / Яна ляціць нашмат хутчэй, / Чым зрок пільнуючых вачэй. / Я песню выдыхнуў у свет / І знікла недзе, немавед; / Хто ж гэткі хуткі, каб заспеў / Прапільнаваць парыўны спеў? / Праз годы адшукаў – стралу / У дубе цэлая была; / А песню ўсю сваю наноў / У сэрцы сябра я знайшоў» [2, с. 29].

Ці не назіраецца ў вершы М. Багдановіча генетычная (і таксама тыпалагічная) сувязь са знакамітым творам амерыканскага пісьменніка? Вобраз знікаючай стралы, які «счэплены» (калі пазычыць тэрмін з квантавай механікі – то «зблытаны») з вобразам бліскучай і хуткай думкі, «выдыхнутай» паэтычным словам, выступае вязьмом гэтых двух твораў. Увогуле, імгненнасці натхнення, азарэнню рамантыкі надавалі вялікае значэнне, толькі ў гэтай летуценнасці, калі адсутнічае «прыземлены» аналіз розуму, і хаваецца ісціна – праўда творчасці. Вялікі паэт-рамантык А. Міцкевіч пісаў: «Пранікненне ў тое, што адбываецца ў парыве азарэння, – складае аснову мастацтва» [3, с. 420].

Сімптаматычна, што і ў А. Міцкевіча ў першай частцы «Дзядоў» таксама знаходзім вобраз нечакана злоўленай песні, і яна становіцца больш важнай, чым матэрыяльная каштоўнасць, – здабыча на паляванні: «ГУСТАЎ / Я песеньку злавіў! Як запалаюць гневам / Мае сябры, што я вярнуўся без дзічыны, / Іх улагоджу зычным і бадзёрым спевам» [4, с. 211].

Расійскі даследчык літаратуры А. Федотаў выяўляе генетычныя і тыпалагічныя сувязі некаторых санетаў М. Багдановіча і «Крымскіх санетаў» А. Міцкевіча. Несумненна, творчасць аўтара «Вянка» карэлюе з рамантызмам. Беларускі паэт свядома звяртаецца да прызнаных узорнымі твораў эпохі рамантызму. Пацвярджэннем гэтаму могуць быць два пераклады санета французскага рамантыка А.-Ф. Арвера «Санет» («Я тайну ў глыбіні душы хаваю…») на рускую і беларускую мовы, прытым пераклады даволі адрозніваюцца. М. Багдановіч дапускае «вольнасць» у беларускім варыянце, нібыта дапаўняючы аўтара, ствараe аксюмаран: «у жыцці мінутным – вечную любоў» [1, с. 382]. Відавочна, што беларускаму паэту было важна асэнсаваць вобраз узнёслага кахання, адкрытага рамантыкамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Але ж рамантызм М. Багдановіча – гэта тонкая, гнуткая аснова для сучасных паэту літаратурных зацікаўленняў. Напрыклад, у вершы, прысвечаным Каганцу, дзе ўзнімаецца тэма паэта і паэзіі, ён піша: «Змоўк пясняр, затаіў свае песні, / Ён іх болей ужо не пяе. / Але рвуцца яны, і калісь на прадвесні / Лёд халодны ў душы пад напорам іх трэсне, / І струёй лынуць вершы з яе. / Гэтак часам уходзіць у землю крыніца, / Дзесь у нетрах таемна бяжыць, / Але мусіць урэшце на волю прабіцца, / Шмат яшчэ па зямлі будзе ліцца-каціцца / І радзімаму краю служыць» [1, с. 105].

Гэты вобраз, шмат разоў адбіты ў літаратуры (сустракаем яго ў ІІІ-й частцы «Дзядоў» А. Міцкевіча), прыйшоў да М. Багдановіча выкрышталізаваны, правераны часам. «Таемны бег» крыніцы паэзіі можа адкрыць пясняр, падобна чалавеку, што шукае ваду з лазою, які тонка адчувае ледзь прыкметныя зрухі свежай галіны. І адкрывае ён вечны выток паэзіі: каб «радзімаму краю служыць». Сутнасць паэзіі, паводле М. Багдановіча, тая самая, што і ў А. Міцкевіча, аднак, вялікая ўвага пры гэтым надаецца інтэрпрэтацыі прыроднай стыхіі. Калі А. Міцкевіч у «здабыванні» мастацкага слова больш давяраўся прыроднаму генію душы творца – адсюль найвышэйшае праява паэзіі – імправізацыя, – то ў М. Багдановіча прысутнічае моцны класіцыстычны пачатак, дзе паэзія абавязкова павінна прайсці агранку майстэрствам і навукай, і толькі тады яна, зробленая і адточаная, зможа апеляваць да сумлення людзей, да іх маральнасці і дабрадзейнасці. У вершы з назваю «Песняру» ён маніфестуе ўласныя прынцыпы паэзіі: «Ведай, браце малады, што ў грудзях у людзей / Сэрцы цвёрдыя, быццам з камення. / Разаб'ецца аб іх слабы верш заўсягды, / Не збудзіўшы святога сумлення. / Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш, / Абрабіць яго трэба з цярпеннем» [1, с. 126].

Аналізуючы паэзію М. Багдановіча, мы можам параўнаць яе з букетам, складзеным з розных літаратурных напрамкаў: неакласіцызм, імпрэсіянізм, сімвалізм, рамантызм. Аднак апошні, можна дапусціць, знаходзіцца ў цэнтры. Паэт уласна вынайдзенымі фарбамі аздабляў увабраную засвоеную ім кніжную рамантычную традыцыю.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 1992.
2. Мінскевіч, С. Як прасачыць палёт стралы і песні? / С. Мінскевіч // Роднае слова. – 2006. – № 7. – С. 28–29.
3. Жемчужины мысли : сб. афоризмов, крылатых выражений. – Минск, 1991.
4. Міцкевіч, А. Дзяды : у 2 т. / А. Міцкевіч. – Т. 1. – Мінск, 1999.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ